*Ірына Грамовіч*

**ВЫКАРЫСТАННЕ МАСТАЦКА-ВЫРАЗНЫХ СРОДКАЎ У СЦЭНІЧНЫМ УВАСАБЛЕННІ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕСНІ**

Адной з найбольш важных задач передачы сэнса народнай песні з'яўляецца стварэнне яе мастацкага вобраза і сцэнічнае ўвасабленне песеннага твора. Дасягненне вакальна-тэхнічных навыкаў і ўменняў не павінна быць самамэтай і ставіцца ў адрыве ад мастацкага асэнсавання, передачы сэнсу і сюжэтнай стужкі народнай песні. Кіраўнік фальклорнага калектыву павінен спалучаць сваю творчую працу над вакальнай тэхнікай са стварэннем мастацкага вобраза. Для трактоўкі народнай песні немалаважныя сцэнічныя паводзіны спевакоў, характар гукавядзення, дынаміка, тэмбравы колер, тэмпрытм, характэрнасць гучання песні.

Калі мы вызначаем агульны творчы падыход і музыкальную культуру кіраўніка, тады падкрэсліваем, што станаўленне спевакоў і кіраўніка (як творцаў), немагчыма без імкнення слухаць і адчуваць, здольнасці думаць і разважаць, ствараючы непаўторны мастацкі вобраз.

Вядомая расійская выкладчыца і хормайстар Н.К. Мешко вызначыла, што перадача зместу народнай песні немагчыма без вобразнага мыслення, якое выражаецца ў такія складаючыя, як прадстаўленне, асэнсаванне, бачанне і азарэнне. Прадстаўленне ўзнікае ў выніку эмацыянальнай узбуджанасці, з мэтай спасціжэння і разумення песні. Асэнсаванне адбываецца ў час вывучэння і ўжывання ў сэнс твора, потым адлюстроўваецца ў бачанні сэнса мастацкай формы і вобраза. І, нарэшце, азарэнне прыводзіць да творчага асэнсавання і прадстаўлення цэльнага музычнага вобраза песні [3, с. 6].

Што ў першую чаргу закранае ў выкананні народнай песні? Непасрэднасць, шчырасць, эмацыянальнасць спеваў. У аўтэнтычным музыцыраванні няма дырыжора. Ніхто спецыяльна не займаецца падрыхтоўкай выканання. Нягледзячы на гэта народныя спевы завараджываюць, захватываюць, аб'ядноўваюць. Носьбіты традыцый з'яўляюцца асновай для вывучэння майстэрства нашых маладых выканаўцаў і харавых калектываў. Вопытным і лепшым спевакам неабходна давяраць і вучыцца з такой праўдзівасцю імгнення настраівацца на эмацыянальны лад песні.

Як вядома стварэнне мастацкага вобразу немагчыма без працы над гукавядзеннем, тэмпарытмам, тэмбральным колерам, фразіроўкай, мовай, дынамікай.

Творчы падыход да выконваемага твору задача няпростая. Авалоданне майстэрствам «падачы» песні вядзецца на працягу ўсяго творчага жыцця і залежыть ад прафесіяналізму кіраўніка, ведання асаблівасцей народнапесенных традыцый і манеры выканання, а таксама ад яго музыкальнай культуры.

У партытурах народных песень, як правіла, не выстаўляюцца нюансы. У аўтарскай партытуры нюансы выяўляюць адносіны кампазітара да выканання твора-кампазітара ці дырыжора. У народна-аўтэнтычным музыцыраванні ў кожнай песне ўстанаўліваецца адзін з асноўных узровень гучнасці. Дынаміка залежыць ад зместу песні, ад жанра песні і абставін, у якіх гэта песня выконваецца ў быту.

Характар выкання, гукавой і дынамічны вобраз заўсёды вызачаецца зместам песні. Слова – адно з самых выразных сродкаў народнага песеннага майстэрства, ісходзячы з гэтага выканаўцы знаходзяць і дынамічныя адценні.

Фразіроўка, як важны мастацка-выразны сродак, можна параўнаць з выразнай мовай з пэўнай сэнсавай логікай. Дзякуючы дакладнаму вывучэнню тэкста народнай песні, хормайстар павінен выдзеліць галоўнае слова, асноўную думку фразы. Без адчування сэнса слоў і тэкста песні немагчыма стварыць выразныя спевы. «Выразнае, сапраўды мастацкае выкананне заўсёды звязана з жывым і эмацыянальнымі адносінамі да того, аб чым спяваеш, і дасягаецца дзякуючы дакладнай растаноўке фразеялагічных акцэнтаў» [4, с.159 ].

Для дасягнення фразіроўкі выкарыстоўваюцца агогіка, дынаміка, а таксама дыханне, тэмбр, цэзуры. Цэзура-ледзь заметная паветраная паўза. Можа выкарыстоўвацца дзвума спосабамі : непасрэдна зменай дыхання ці на адным дыханні, але з кароткай паўзай у гуке; выконваецца за лік працягласці папярэдняй фразы, а не за лік затрымкі наступнай. Гучанне народнай песні успрымаецца як цэльны арганічны твор, калі ў выкананні маецца падпарадкаванне музычных фраз, сказаў і захоўваецца логіка іх унутранага развіцця і агульнага развіцця твора. Няма твораў, дзе дынаміка статычна. Умелае выкарыстанне дынамічных адценняў намнога павышае мастацкую каштоўнасць выконваемага твора.

Пэўныя адносіны да вобраза песні, да яе ўнутранага зместу выражаецца, дзякуючы нюансіроўцы. У пачатку ўзораў аўтэнтычнага фальклору выстаўлены адзіны нюанс, які і вызначае асноўны гукавы вобраз песні. Задача хормайстра «размаляваць» музыкальны твор, ужыць тонкую нюансіроўку харавой гучнасці для перадачы мастацкага вобраза. Узровень асноўнай гучнасці можа мяняцца ў залежнасці ад зместу песні і яе жанравай прыналежнасці. Часам павялічэнне дынамікі суправаджаецца паскарэннем тэмпа.

Больш складана наладзіць дынаміку ў творах куплетнай формы. Каб пазбегнуць аднастайнасці, хормайстар ужывае дынамічныя адценні: спалучэнне ўзмацнення гуку і памяншэння, у залежнасці ад сэнсу народнай песні. Вельмі важным з'яўляецца авалоданне ціхімі спевамі на piano ў лірычных песнях, уменні філіраваць, паступова памяншаць гук. Для гэтага патрабуецца праца над майстэрствам адчування апоры дыхання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзякуючы метрарытму і тэмпу магчыма передаць розны эмацыянальны настрой: спакойную раўнавагу, розны настрой, эмацыянальную ўзбуджанасць, яскравасць і сціпласць пачуццяў і інш. Хормайстар павінен улічваць, што нягледзячы на тое, што тэмп выканання твора прапісаны у партытуры, яго можна змяніць ў залежнасці ад акустычных умоў памяшкання, складу хора і інш. Бывае так, што хармайстар па сутнасці поўнасцю змяняе тэмп і прадстаўляе свой творчы падыход да выковаемай песні. Галоўнае, каб змест твора, логіка развіцця музычнай думкі была прадстаўлена лепшым вобразам.

Вельмі важна саблюдаць у спевах гармонію тэкста і рытма. Імкнучыся добра вымавіць тэкст, выканаўцы часам парушаюць рытмічную вастрату выканання і характэрнасць твора. Хормайстар павінен сам адчуць асаблівасці рытму і зразумець, што менавіта неабходна перадаць у выконваемым творы. Складанасць спеваў народнага песеннага калектыву ў тым, што на сцэне ён выступае без дырыжора. Менавіта таму поўная рытмічная сагласаванасць выпрацоўваецца на рэпетыцыях.

Хуткасць выканання і характар рухаў музыкі залежыць ад тэмпу. У народна-песенным мастацтве вельмі распаўсюджана выкананне, якое асацыіруецца з паняццем рытмічнай свабоды (rubata). Гэты прыём дазваляе выканаўцам творча імправізаваць: адны фразы спяваць больш шырока, іншыя больш сціпла. Робіцца гэта вельмі асцярожна, не перашкаджаючы натуральнасці музычнай стужкі. Прыём rubata асабліва незаменімы ў запевах і ў сольным выканальніцтве. Як выразны музыкальны сродак, ён надае народнай песне своеасаблівы ўнутраны імпульс для перадачы розных эмацыянальных пачуццяў.

Яшчэ адным важным сродкам мастацкай выразнасці з'яўляецца фермата. Характэрна для працяжных календарна-абрадавых, пазаабрадавых песень. Ферматы абазначаюцца кампазітарам, а таксама прастаўляюцца ў нотных расшыфроўках фальклорнага музычнага матэрыялу. Як правіла фермата выковаецца ў канцы твора, але сустракаецца і ў сярэдзіне народнай песні і падрыхтоўваецца паступовым паняншэннем асноўнага тэмпу (ritenuto), Фермата заўсёды лагічна звязана з тэкстам песні. Яе прысутнасць звычайна вызвана неабходнасцю музыкальнай пабудовы народнай песні. Ужыванне ферматы і яе працягласць не мае нейкай пэўнай нормы і залежыць ад яе палажэння ў фразе і музычнага сэнса.

Кожны харавы калектыў мае сваю тэмбравую афарбоўку. Ён можа гучаць гучна, глуха, яскрава, бархатна, моцна ці празрыста. Па першае, гэта звязана з тэмбральнай якасцю галасоў спевакоў таго ці іншага калектыву, а па другое, ў сувязі з характарам выковаемага твору. Як вядома на тэмбравае гучанне уздзейнічае тэматыкі песні. Для гэтага хормайстар патрабуе ад выканаўцаў зрабіць розныя маніпуляцыі з мэтай змянення тэмбравага колеру. Напрыклад: змяніць форму рота, наблізіць гук, ці зрабіць больш далёкім, змяніць міміку, эмацыянальную падачу і г.д. Лірычная песня прагучыць добра ў тым выпадку, калі спевакі будуць спяваць спакойнымі мяккімі тэмбрамі, загукальныя вяснянкі, з экспрэсіўным гучнымі спевамі патрабуюць блязкай светлай падачы гука «на верхнія зубы, уперад», жніўныя песні напружанага гучання патрабуюць больш глыбокага тэмбральнага адцення і больш глыбокага фарміравання гука, жартоўныя песні прагучаць весела ў тым выпадку, калі хор будзе фарміраваць гукі блізка, «на ўсмешцы».

Спецыфіка народнапесеннага выканальніцтва патрабуе навыкаў і ўменняў шырокага і адкрытага гукаўтварэння. У харавых спевах значнае месца займаюць такія прыёмы гукавядзення, як legato, staccato і non legato. Належнасць арнаментаванай меладычнай стужкі ў шматлікіх беларускіх народных песнях з рознымі ўпрыгожваннямі прадугледжвае майстэрства выканання гэтых упрыгожванняў. Тут свой, своеасаблівы від гукавядзення. Асобы каларыт надае спевам ужыванне прыёмаў «гульні» голасам: розныя слізганні, прыгукі і зацяганні, глісандзіраванне, спады і ўздрыгванні голасу. Гэтыя прыёмы дыктуюцца характарам і жанравай прыналежнасцю народнай песні, асаблівасцямі яе фактурнага ізлажэння. Такія вакальныя штрыхі выпрацоўваюцца асобна, дзякуючы розным практыкаванням.

Сінкрэтызм фальклорнага мастацтва дазваляе выкарыстоўваць музычнае суправаджэнне народных інструментаў, танцавальныя рухі, тэатралізацыю народнай песні ці абрадавага дзеяння. Умелае спалучэнне такіх мастацка-выразных і музычных сродкаў дапаможа яшчэ больш поўна ўпрыгожыць і раскрыць мастацкі вобраз народнай песні ў сцэнічных умовах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс літаратуры:**


1. Калугина, Н.В. Методика работы с русским народным хором : учеб. для муз. вузов / Н.В. Калугина. – Мінск : Музыка, 1977. – 271 с.
2. .Мешко, Н.К. Искусство народного пения. Практическое руководство и методика обучения искусству народного пения : учеб. пособ. для педагогов и студ. средн. и высш. учебн. заведений, рук. и артистов народных хоров и ансамблей / Н.К. Мешко. – Вып. 2. – Мінск : НОУ «ЛУЧ», 2000. – 8 с.
3. Мешко, Н.К. Искусство народного пения. Практическое рук-во и методика обучения искусству народного пения / Н.К. Мешко. – Ч. 2. – Мінск : НОУ «ЛУЧ», 2000. – 80 с.
4. Шамина, Л.В. Работа с самодеятельным хоровым коллективом / Л.В. Шамина. – Мінск : Музыка, 1983. – 176 с.
5. Холупава, Л.И. Пастаноўка голасу і вакальны ансамбль : вучэб. дапам. /Л.І. Холупава, І.М. Грамовіч, Л.Л. Ражкова. – Мінск : Бел.дзярж.ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 189 с.